УДК 94 (4)

# ПАЛІТЫКА САВЕЦКАГА КІРАЎНІЦТВА Ў АДНОСІНАХ ДА ЛІТОЎСКІХ І ЎКРАІНСКІХ ШКОЛ БССР ДРУГОЙ ПАЛОВЫ 1940-Х–1950-Х ГГ.

***Таццяна Маржала***
*Мінск, Беларусь*

Школы этнічных меншасцей БССР (акрамя рускамоўных школ), як і беларускія нацыянальныя школы, былі заложнікамі нацыянальна-моўнай палітыкі, якая праводзілася саюзным цэнтрам і была накіравана ў сферы адукацыі на яе інтэрнацыяналізацыю шляхам выцяснення нацыянальных моў і захавання прыярытэту рускай мовы. Амаль усе школы, якія працавалі на мовах меншасцей у перадваенны час, аднавілі сваю дзейнасць у абазначаны вышэй пасляваенны перыяд, праўда, у нязначнай колькасці і на вельмі кароткі тэрмін. Невялікая колькасць прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей у параўнанні з беларусамі і тое, што руская мова не з’яўлялася іх роднай мовай, ва ўмовах тагачаснай дзяржаўнай палітыкі ставіла пытанне не так пра становішча школ этнічных меншасцей, колькі пра іх існаванне.

У адрозненні ад перадваенных гадоў літоўцы перасталі адыгрываць прыкметную ролю ў БССР. У 1930-я гады выдаваліся падручнікі і літаратура на літоўскай мове. У месцах іх кампактнага рассялення дзейнічалі літоўскія школы. У 1936 годзе іх існавала 9, а таксама 2 нацыянальна-змешаныя школы: 1 літоўска-латышская і 1 беларуска-літоўская [1, с. 387]. Уз’яднанне Заходняй Беларусі з БССР тым больш узняло пытанне адукацыі этнічных меншасцей, таму што значную частку насельніцтва Гродзеншчыны, Брэстчыны і Беласточчыны складалі менавіта яны (палякі, літоўцы, украінцы). На гэтых тэрыторыях у 1940/41 навучальным годзе працавалі 63 літоўскія школы, якія складалі 1,1 % ад усіх школ [2, s. 162]. Але колькасць літоўцаў паступова змяншлася як у выніку рэпрэсій, ваенных падзей, так і ў выніку міграцыйных працэсаў, якія ўзмацніліся пасля падпісання ў кастрычніку 1939 года дагавора аб далучэнні Літвы да СССР. Літве адышлі Віленскі край, Свянцянскі і частка раёнаў Баранавіцкай і Віленскай абласцей, а большая частка літоўцаў, якія пражывалі ў паўночна-заходніх раёнах і з’яўляліся носьбітамі сваёй мовы, перасялілася на тэрыторыю Літвы.

На працягу 1945-1956 гг. на тэрыторыі Беларусі не існавала школ з літоўскай мовай навучання, што было выклікана не толькі дэмаграфічнымі працэсамі, але і пэўнай палітычнай нестабільнасцю раёнаў, дзе пражывала літоўская меншасць. Таму што савецкае кіраўніцтва было зацікаўлена ў больш хуткім уключэнні заходніх абласцей рэспублікі ў агульнасаюзныя структуры грамадска-палітычнага жыцця. У 1944-1953 гг. у Сапоцкінскім і Радуньскім раёнах Гродзенскай вобласці, а таксама Астравецкім, Свірскім і Пастаўскім раёнах Маладзечанскай вобласці дзейнічала літоўскае антысавецкае падполле. Уплыў літоўскага падполля на ўнутрыпалітычныя працэсы БССР быў не такім значным, як дзейнасць Арміі Краёвай ці Арганізацыі ўкраінскіх нацыяналістаў, але яно таксама ўяўляла з сябе даволі шматлікую і законспіраваную арганізацыйную структуру.

Праблема адукацыі на літоўскай мове паўстала ізноў у другой палове 1950-х гадоў, калі літоўскае падполле было ліквідавана, а на тэрыторыю Беларусі пачала перасяляцца некаторая колькасць літоўцаў. У гэты час у Беларусі пражывала 8 363 літоўцы (ці 0,1 % ад агульнай колькасці насельніцтва) [3, с. 16]. Паводле даных перапісу 1959 года, 6,4 тыс. літоўцаў (ці 77,2 %) назвалі роднай мову сваёй нацыянальнасці, 949 чалавек (ці 11,3 %) - рускую і 857 (ці 10,2 %) - беларускую. Паколькі большасць літоўцаў пражывала ў Астравецкім і Воранаўскім раёнах Гродзенскай воблсці, тут у 1957 годзе былі створаны 8 школ з выкладаннем літоўскай мовы [1, с. 387], Аднак існаванне такіх школ можна лічыць фармальным, таму што з прычыны адсутнасці адпаведных

ПолесГУ

педагагічных кадраў і падручнікаў на літоўскай мове большасць прадметаў тут выкладалася на рускай ці беларускай мовах.

У 1940/41 навучальным годзе ў заходніх абласцях Беларусі дзейнічала 49 украінскіх школ, што складала амаль адзін працэнт ад тагачаснай колькасці школ. У месцах кампактнага пражывання ўкраінцаў працэнт такіх школ быў яшчэ вышэйшым. Так, на Брэстчыне ўкраінскія школы складалі 6 % [4, s. 174]. Пасля вайны, у 1945/46 навучальным годзе, на тэрыторыі Беларусі існавалі 17 украінскіх школ [5, с. 213]. У 1950/51 навучальным годзе яшчэ працавалі 11 такіх школ (ці 0,09 % ад агульнай колькасці школ), у якіх вучылася 1 213 чалавек [6, арк. 4]. Школы з украінскай мовай выкладання працавалі ў пагранічных з УССР раёнах Брэсцкай, Пінскай і Палескай абласцей. Праўда, існаванне украінскіх школ, па аналогіі з пазнейшымі літоўскімі, насіла хутчэй фармальны характар, бо ў рэспубліцы амаль не было педагагічных кадраў, якія валодалі б украінскай мовай, не друкавалася адпаведная метадычная літаратура і падручнікі на гэтай мове. Таму выкладанне многіх прадметаў у такіх школах часта ішло на рускай мове.

Калі ў апошнія перадваенныя гады рэарганізацыя школьнай сістэмы была накіравана на задавальненне нацыянальных патрэб усіх народаў у галіне асветы, дык на рубяжы 1940-1950 гг. сістэма адукацыі этнічных меншасцей практычна перастала існаваць у выніку палітыкі партыі, накіраванай на "зліццё" нацый і моў. Школы этнічных меншасцей (не ўлічваючы рускамоўныя) у пасляваенныя гады знаходзіліся ў асноўным на тэрыторыі Заходняй Беларусі. У гэты час асаблівая ўвага да школ нацыянальных меншасцей з боку партыйнага кіраўніцтва і спецслужбаў была выклікана не ў апошнюю чаргу тым, што пасля вайны сярод насельніцтва заходніх рэгіёнаў мелі месца радыкальныя паводзіны да савецкай улады і "антысавецкая" прапаганда нацыянальных ідэй як саміх беларусаў, так і палякаў, украінцаў, літоўцаў. Савецкае кіраўніцтва было занепакоена нестабільнай сітуацыяй на паўднёвым захадзе Беларусі ў сувязі з дзейнасцю Украінскай паўстанцкай арміі (УПА), якая ўваходзіла ў Арганізацыю ўкраінскіх нацыяналістаў. У інструкцыі ЦК УКП(б)Б ад 20 снежня 1945 года ў якасці адной з галоўных задач Брэсцкай і Пінскай партыйных арганізацый вызначалася "ізаляванне ўкраінскіх нацыяналістаў" [7, арк. 57]. У выніку назіралася палітычная блакада нестабільных раёнаў і вядома ж ігнараванне нацыянальна-культурных інтарэсаў жыхароў.

Да пачатку 1950-х гадоў дзейнасць УПА ў цэлым была падаўлена. Вялікая колькасць сем'яў украінскіх паўстанцаў у 1945-1947 гг. была дэпартавана ў Сібір. Шмат украінцаў з поўдня БССР з канца 1940-х гадоў перасялілася ў Калінінградскую вобласць. У пачатку 1950-х гадоў пачала выязджаць частка ўкраінскага насельніцтва, якое прыбыла ў рэспубліку ў сувязі з голадам 1946 года. Як бачым, стан украінскіх школ, як і іншых школ нацыянальных меншасцей, залежаў ад палітычна-дэмаграфічнай сітуацыі. У паўднёвых раёнах Брэсцкай і Пінскай абласцей мясцовае насельніцтва намагалася дабіцца ад уладаў адкрыцця дадатковай колькасці ўкраінскіх школ, аднак беспаспяхова. У канцы 1950-х гадоў доля ўкраінцаў сярод насельніцтва Беларусі складала, паводле афіцыйных звестак, 133 061 чал. (ці 1,7 %) [8, с. 9]. Нягледзячы на гэта, у рэспубліцы з пачатку 1950-х гадоў не існавала ніводнай украінскай школы. Апошнія з іх спынілі сваю дзейнасць у 1952 годзе.

1. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭН, 1993-2003. – Т. 4 : Кадэты – Ляшчэня / Г.П. Пашкоў [і інш.]. – 1997. - 432 с.
2. Jackiewicz, S.A. Oswiata narodowa na Bialorusi zachodniej w latach 1939/41 / S.A. Jackiewicz // Spoleczenstwo bialoruskie, litewskie i polskie na ziemiach polnocnowschodnich II Rzeczypospolitej w latach 1939/41 : materialy z konferencji naukowej, Warszawa, 1993 / Instytut studiow politycznych (PAN) ; pod red. M. Gizejewskiej. – Warszawa, 1995. – S. 161-167.



Полесгу

3. Национальный состав населения Республики Беларусь и распространённость языков : стат. сб. – Минск : Информстат Минстата РБ, 2001. – 451 с.
4. Pietrowska, O.W. Polityka w dziedzinie oswiaty i kultury na obszarze Polesia Brzeskiego w latach 1939/41 / O.W. Pietrowska // Spoleczenstwo bialoruskie, litewskie i polskie na ziemiach polnocnowschodnich II Rzeczypospolitej w latach 1939/41 : materialy z konferencji naukowej, Warszawa, 1993 / Instytut studiow politycznych (PAN) ; pod red. M. Gizejewskiej. – Warszawa, 1995. – S. 168-183.
5. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭН, 1993-2003. – Т. 6., кн. II : Усвея – Яшын / Г.П. Пашкоў [і інш.]. – 2003. – 616 с.
6. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Фонд 42. – Воп. 4. – Спр. 168. Годовой отчёт о работе школ БССР за 1950/51 учебный год.
7. Бодак, А.Ю. Национальная политика в БССР (1943/55 гг.): дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / А.Ю. Бодак. – Минск, 1996. – 179 л.
8. Народное хозяйство БССР : стат. сб. – Минск : Госиздат БССР, 1963. – 511 с.
ПолесГУ